# ГІСТОРЫЯ

УДК 94(976)«17/18»

**А.П. Жытко,**
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ;*

**С.А. Талмачова,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ*

## АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIX ст.)

Унутрыпалітычны крызіс у Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. прывёў да аслаблення дзяржавы. Гэту сітуацыю ў сваіх інтарэсах выкарысталі памежныя з ёй манархіі – Расійская, Аўстра-Венгерская і Пруская. У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай з карты Еўропы знікла вялікая дзяржава. Праблема Рэчы Паспалітай на працягу XIX – пачатку XX ст. была краевугольнай у знешнепалітычных стасунках еўрапейскіх краін.

Да Расійскай імперыі была далучана сучасная тэрыторыя Беларусі. Разам з тым, праблема новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання практычна не з'яўлялася прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай і расійскай гістарыяграфіі.

Значным укладам у распрацоўку праблемы падзелаў і гісторыі мясцовых дзяржаўных устаноў з'явіліся выданні, падрыхтаваныя супрацоўнікамі БелНДІДАС: «Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917)», «Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917)» [1–2]. Палітычныя аспекты падзелаў Рэчы Паспалітай знайшлі сваё адлюстраванне ў манаграфіях Я.К. Анішчанкі [3].

*Мэта артыкула* – выявіць працэс і сутнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання Беларусі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай.

У ліпені 1772 г. паміж Расіяй і Аўстра-Венгрыяй была падпісана Канвенцыя адносна першага падзелу Рэчы Паспалітай. У ёй вызначалася геаграфічная мяжа тых тэрыторый, якія адыходзілі да Расійскай імперыі. Яна пачыналася ад польскай Ліфляндыі па правым беразе р. Дзвіна і стала мяжой паміж дзвюма дзяржавамі. Далей падзел праходзіў да пункта злучэння трох ваяводстваў (Полацкага, Віцебскага і Мінскага), а ад яго – па прамой лініі да вытокаў р. Друць каля мястэчка Орша, а затым – па цячэнні гэтай ракі да ўпадзення ў р. Днепр. На ўсходзе р. Днепр з'явілася натуральнай мяжой паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай [4, с. 26–29; 5, с. 553–555].

Па першым падзеле Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі адышла тэрыторыя плошчай 83 тыс. км$^2$, на якой жылі 1 млн 225 тыс. чал. [6, с. 444]. У сакавіку – снежні 1773 г. спецыяльная экспедыцыя Акадэміі навук на чале з І. Ляпёхіным вызначыла геаграфічныя каардынаты мясцовасці, што служыла падставай для яе дакладнага картаграфавання. Але згаданыя мерапрыемствы не закранулі размеркавання тэрыторыі паміж вызначанымі адміністрацыйнымі адзінкамі [7, с. 62]. Такім чынам, далучаныя землі, што раней уваходзілі ў склад Полацкага, Віцебскага, Мсціслаўскага і часткі Мінскага ваяводстваў, увайшлі ў склад дзвюх губерняў: Пскоўскай і Магілёўскай. Пскоўская складалася з 5 правінцый: дзвюх велікарускіх – Пскоўскай і Велікалуцкай, і трох беларускіх – Дзвінскай, якая раней мела назву польскай Ліфляндыі, Полацкай, у склад якой увайшлі часткі Полацкага ваяводства і Віцебскага правей р. Дзвіна і Віцебскай правінцыі. Губернскім горадам стаў г. Апочка. Але ён быў невялікім, таму цэнтр губерні неўзабаве перанеслі ў г. Полацк.

У склад Магілёўскай губерні ўвайшлі 4 правінцыі: Магілёўская, Аршанская, Рагачоўская і Віцебская. Губернскім горадам стаў г. Магілёў. На чале першай губерні быў прызначаны генерал-маёр Каханоўскі, а другой – М. Крачэтнікаў. Гэтыя губерні склалі генерал-губернатарства пад кіраўніцтвам графа З. Чарнышова [5, с. 507–511]. У наказе Кацярыны II на імя генарал-губернатара З. Чарнышова ўскладвалася задача аб захаванні парадку і спакою ў новых правінцыях, недапушчэння «ўсякага прыгнёту, прыцяснення», разбояў і забойстваў, ахова асабістай і маёмаснай бяспекі ўсіх жыхароў, якія далі прысягу на вернасць расійскай кароне. Ён павінен быў арганізаваць перапіс усіх паветаў,

гарадоў, мястэчак і вёсак, устанавіць колькасць жыхароў, даходаў і мытных збораў, якія збіраліся з іх у казну, а таксама скласці карты паветаў і гарадоў з прапановай аб іх адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні [5, с. 507–511].

22 ліпеня 1773 г. выйшаў указ аб падзеле беларускіх губерняў на паветы і аб уладкаванні ў іх павятовых камісараў з канцылярыямі, у адпаведнасці з якімі кожная з правінцый была падзелена на 2 паветы. Павятовымі гарадамі былі вызначаны ў беларускай частцы Пскоўскай губерні: у Полацкай правінцыі – мястэчка Себеж і Невель, у Віцебскай правінцыі – мястэчкі Веліж і Гарадок, у Дзвінскай – мястэчкі Рэжыца і Марыенгаўзен [5, № 14014; 8, ч. 2, табл. 4к, № 14014].

Напярэдадні і ў час рэалізацыі рэформы 1775 г. паўстала пытанне аб мэтазгоднасці далейшага аб'яднання ў складзе Пскоўскай губерні новадалучанай тэрыторыі з велікарускімі правінцыямі, на якія не распаўсюджваліся выключэнні з так званых польскіх правоў. 24 жніўня 1776 г. З. Чарнышоў прапанаваў аддзяліць рускія правінцыі ад беларускіх. Кацярына II ухваліла гэту ідэю [7, с. 63].

У складзе названых правінцый і паветаў Пскоўская губерня праіснавала да жніўня 1776 г. Пры адзначанай рэарганізацыі няпростым аказалася вызначэнне рэзідэнцый павятовай адміністрацыі, бо гэта патрабавала выкупу прыватнаўласніцкіх мястэчак і перапланіроўкі сёл, што вымагала значных сродкаў. Тэмпу рэформы перашкодзілі пераход дзяржаўных уладанняў ва ўласнасць новым рускім уладальнікам і зварот іх папярэднім трымальнікам. Складанасці вынікалі і ў сувязі з тым, што адна прыватная Магілёўская эканомія займала практычна ўсю тэрыторыю адпаведнай правінцыі.

Пры рэалізацыі рэформы З. Чарнышоў зыходзіў з няроўнасці Пскоўскай і Магілёўскай губерняў у падатковых адносінах. Каб дасягнуць жаданага адзінства, ён раіў перавесці Віцебскую правінцыю ў склад Магілёўскай губерні з усімі трыма паветамі (Віцебскім, Веліжскім і Гарадокскім) – усяго 85 615 хрысціян і 2 633 яўрэяў, або 88 248 акладных душ [7, с. 64]. Па ўказе Сената ад 24 жніўня 1776 г. беларускія правінцыі былі вылучаны са складу Пскоўскай губерні ў асобную Полацкую губерню [9, № 14499].

Указам ад 22 сакавіка 1777 г. Кацярына II вызначыла новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне Полацкай губерні. У яе склад увайшлі 11 паветаў: Полацкі, Дрысенскі, Себежскі, Невельскі, Дынабургскі, Рэжыцкі, Люцынскі, Віцебскі, Веліжскі, Гарадокскі і Суражскі [9, № 14603, 14691]. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай 1793 г. у складзе Полацкай губерні з новых далучанных тэрыторый быў створаны новы дванаццаты – Лепельскі павет.

У склад Магілёўскай губерні ўвайшлі Магілёўскі, Чавускі, Старабыхаўскі, Аршанскі, Бабінавіцкі, Сенненскі, Мсціслаўскі, Чэрыкаўскі, Копыскі, Клімавіцкі, Рагачоўскі і Беліцкі паветы. У сувязі з гэтым мястэчкі Сураж, Чавусы, Копысь, Бабінавічы, Клімавічы і Беліца атрымалі статус гарадоў і сталі павятовымі цэнтрамі.

Падзел на правінцыі быў скасаваны. У беларускіх губернях уводзілася кіраванне па ўзоры велікарускіх губерняў у адпаведнасці з Установай для кіравання губернямі ад 7 лістапада 1775 г. [9, № 14392]. Такім чынам, Расійская імперыя падзялялася на губерні з колькасцю насельніцтва ад 300 тыс. да 400 тыс. чалавек мужчынскага полу. Губерні ж дзяліліся на паветы з насельніцтвам ад 20 тыс. да 30 тыс. чалавек мужчынскага полу [5, с. 234–271]. З 1778 г. Магілёўская і Полацкая губерні называліся намесніцтвамі [10, с. 120, 122].

Для ўладкавання меж губерняў, а таксама ў ваенных і гаспадарчых мэтах узнікла неабходнасць правядзення іх апісання, вымярэння і картаграфавання. На працягу 1772–1774 гг. былі складзены два камеральныя апісанні: агульнае – на далучаную ўсходнебеларускую тэрыторыю і спецыяльнае – на казённыя вёскі. Агульнае апісанне дало адміністрацыі губерняў статыстычную характарыстыку тэрыторыі, а спецыяльнае – вызначыла зямельны фонд, які з'яўляўся крыніцай даходаў для казны, а таксама мог быць выкарыстаны для падараванняў [11, с. 77]. У 1783–1785 гг. у Магілёўскай і Полацкай губернях было праведзена генеральнае межаванне, якое скасавала папярэднія правы на валоданне зямлёй і дакументальна афармляла правы новай улады на далучаныя землі [12, с. 13–14, 132].

Радыкалізацыя Вялікай французскай рэвалюцыі, тэрор у адносінах да прадстаўнікоў вышэйшай французскай арыстакратыі, распаўсюджанне ідэй ідэолагаў асветніцтва на тэрыторыі Рэчы Паспалітай паслужылі фармальнай падставай для другога (1793 г.) падзелу гэтай дзяржавы. У выніку яго да Расійскай імперыі адышлі землі, мяжа якіх пачыналася ад м. Друя, якое знаходзілася на левым беразе р. Дзвіна, далей праходзіла праз Нарач і Дубровы ў напрамку Стоўбцы – Нясвіж – Пінск да меж Галіцыі [13, с. 16].

Па другім падзеле Рэчы Паспалітай паміж Расіяй і Прусіяй, які быў зацверджаны 14 сакавіка 1793 г. на сойме ў Гродне, Расія атрымала Мінскую, Валынскую і Падольскую землі, з якіх па ўказе Кацярыны II ад 31 сакавіка 1793 г. былі створаны 3 намесніцтвы: Мінскае, Ізяслаўскае і Брацлаўскае [14, с. 43].

Да Расійскай імперыі адышла тэрыторыя ў 92 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 1,3 млн чал. У маніфесце царскі ўрад гарантаваў свабоду веры, недатыкальнасць уласнасці па прыкладзе жыхароў расійскіх губерняў. Указам ад 13 красавіка 1793 г. Кацярына ІІ прызначыла на пасаду генерал-губернатара трох новаўтвораных губерняў М. Крачэтнікава. Губернатарам Мінскай губерні быў прызначаны генерал-маёр І. Няплюеў. Пры гэтым Кацярына ІІ раіла далучыць да Полацкага намесніцтва рэшткі Полацкага ваяводства, да Магілёўскага намесніцтва – рэшткі таго ж ваяводства да р. Бярэзіны, а Мазырскі павет размеркаваць паміж Чарнігаўскай і Кіеўскай губернямі. У спіс першачарговых мерапрыемстваў уваходзіла картаграфаванне тэрыторыі, перапіс насельніцтва, прывядзенне жыхароў да прысягі на вернападданасць незалежна ад іх саслоўнага стану, назначэнне вярхоўнай расійскай адміністрацыі з допушчэннем у яе мясцовых жыхароў [7, с. 65].

Указам імператрыцы Кацярыны ІІ ад 23 красавіка 1793 г. была заснавана Мінская губерня [15, № 17112], а па ўказе ад 3 мая 1795 г. губерня стала называцца намесніцтвам (у 1796 г. назва «губерня» вернута), а яе тэрыторыя, склад і ўладкаванне былі ўдакладнены. Яна ўключала 13 акруг: Мінскую, Вілейскую, Пастаўскую, Докшыцкую, Дзісенскую, Барысаўскую, Ігуменскую, Бабруйскую, Мазырскую, Давыд-Гарадоцкую, Пінскую, Нясвіжскую і Слуцкую [15, № 17325].

Паводле ўказа імператрыцы Кацярыны ІІ ад 23 красавіка 1793 г. аб уладкаванні Мінскай губерні, адзначалася, што Мінск з гэтага часу будзе губернскім горадам, а гарады Мазыр, Пінск, казённыя мястэчкі Вілейка, Докшыцы, Дзісна, Барысаў, Бабруйск і мястэчка Ігумен, якое знаходзілася ва ўладанні Віленскага біскупа, – павятовымі гарадамі. Прыватнаўласніцкія мястэчкі Нясвіж, Слуцк, Давыд-Гарадок і Паставы таксама станавіліся цэнтрамі аднайменных паветаў, дзе загадана было «ўладкаваць установы для парадку і правасуддзя», аднак яны па-ранейшаму лічыліся ўласнасцю ўладальнікаў, усе правы якіх заставаліся недатыкальнымі. Адначасова гэтым жа указам загадвалася «прыкласці намаганне набыць іх (мястэчкі. – *Аўт.)* у казну шляхам куплі ці абмену» [1, с. 3].

У снежні 1796 г. з ліку павятовых гарадоў былі выключаны Нясвіж, Докшыцы, Давыд-Гарадок і Паставы. У 1797 г. у склад Мінскай губерні з Чарнігаўскай быў перададзены Рэчыцкі павет. Да 1842 г. у Мінскай губерні меліся 10 паветаў: Мінскі, Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Вілейскі, Дзісенскі, Мозырскі, Пінскі, Рэчыцкі і Слуцкі. 18 снежня 1842 г. паводле ўказа Сената «Аб пераўтварэнні Паўночна-Заходніх губерняў» Дзісенскі і Вілейскі паветы адышлі да Віленскай губерні, а да Мінскай быў далучаны Навагрудскі павет Гродзенскай губерні. У складзе 9 паветаў (Бабруйскага, Барысаўскага, Ігуменскага, Мінскага, Мазырскага, Навагрудскага, Пінскага, Рэчыцкага і Слуцкага) Мінская губерня праіснавала да 1917 г. [16].

У сувязі з падаўленнем паўстання 1794 г. на чале з Т. Касцюшкам у 1795 г. адбыўся трэці падзел Рэчы Паспалітай. Да Расійскай імперыі адышлі тэрыторыі, геаграфічная граніца якіх праходзіла ад Галіцыі да р. Буг, затым ад Брэст-Літоўска да р. Нёман у раёне г. Гродна. Уздоўж ракі яна праходзіла да Палангі, а адтуль – каля Рыгі да Балтыйскага мора [4, с. 238–240]. На далучанай тэрыторыі па загадзе Кацярыны ІІ ліфляндскаму, эстляндскаму і літоўскаму генерал-губернатару князю М. Рапніну даручалася падзяліць рэшткі Вялікага Княства Літоўскага на тры часткі з цэнтрамі ў Вільні, Гродне і Коўне. У склад першай увайшлі паветы: Віленскі, Завілейскі, Ашмянскі, Браслаўскі, Лідскі і Трокскі. Да другой – Гродзенскі, Навагрудскі, Слонімскі, Ваўкавыскі і Брэсцкі паветы, а да трэцяй – Ковенскі, Велікамірскі, Упіцкі і Самагіція [17, с. 357]. У г. Гродне знаходзіўся цэнтр кіравання тэрыторыямі Літвы і Заходняй Беларусі. У чэрвені 1795 г. быў створаны часовы орган кіравання – Вярхоўнае праўленне Літвы, якое складалася з чатырох аддзяленняў: казённае (кіраўнік – палкоўнік І. Фрызэль), крымінальнае (І. Русанаў), грамадзянскае (надворны саветнік М. Волкаў), эканамічнае (прэм’ер-маёр Літке) [17, с. 358].

У ліпені 1796 г. гэта адміністрацыйная адзінка была падзелена на два намесніцтвы: Віленскае і Слонімскае. У склад Віленскага намесніцтва ўвайшлі 11 паветаў: Віленскі, Завіленскі, Трокскі, Браслаўскі, Ашмянскі, Ковенскі, Панявежскі, Велікамірскі, Цяльшаўскі, Расонскі і Шавельскі. Слонімскае намесніцтва складалася са Слонімскага, Навагрудскага, Гродзенскага, Ваўкавыскага, Брэсцкага, Кобрынскага, Пружанскага і Лідскага паветаў [18, с. 322; 19, с. 751].

У такім складзе губерні праіснавалі толькі да канца 1796 г. Указам Паўла І ад 12 снежня 1796 г. на тэрыторыі Беларусі і Літвы былі створаны 3 губерні: Беларуская, якая аб’яднала Магілёўскае і Полацкае намесніцтвы, Мінская і Літоўская, у склад якой увайшлі Слонімскае і Віленскае намесніцтвы [20, № 17634].

15 студзеня 1797 г. быў выдадзены загад аб скарачэнні колькасці паветаў. У Літоўскай губерні пакінута тая ж колькасць паветаў, якія былі зацверджаны яшчэ Кацярынай ІІ. У Беларускай губерні былі ліквідаваны 7 паветаў – Быхаўскі, Клімавіцкі, Капыскі, Бабінавіцкі (уваходзілі ў склад былой Магілёўскай губерні),

а таксама Суражскі, Дрысенскі і Рэжыцкі паветы (увaходзілі ў склад былой Полацкай губерні). Да Мінскай губерні быў далучаны Рэчыцкі павет, што ўваходзіў у склад Чарнігаўскай губерні, а да Пінскага павета – частка Луцкага павета Валынскай губерні. З 13 паветаў Мінскай губерні былі ліквідаваны 4 (Пастаўскі, Докшыцкі, Нясвіжскі і Давыд-Гарадоцкі) [7, с. 67–68].

Паводле ўказа Аляксандра I ад 28 жніўня 1801 г. «Аб аднаўленні пяці губерняў і аб падпарадкаванні пагранічных губерняў ваенным губернатарам», былі адноўлены Віцебская і Магілёўская губерні, а Літоўская – падзелена на Віленскую і Гродзенскую. У склад апошняй увайшлі паветы Слонімскай губерні [2, с. 54; 19, с. 751].

У 1842 г. Беластоцкая вобласць з 4 паветамі (Беластоцкім, Сакольскім, Бельскім і Драгічынскім) увайшла ў склад Гродзенскай губерні. Пры гэтым Драгічынскі павет быў аб'яднаны з Бельскім, Лідскі быў далучаны да Віленскай губерні, Навагрудскі – да Мінскай. У выніку ў Гродзенскай губерні засталося 9 паветаў, якія праіснавалі да 1917 г. [19, с. 751].

У сувязі са стварэннем Ковенскай губерні ў 1843 г. у складзе Віленскай губерні засталіся 7 паветаў: Віленскі, Трокскі, Лідскі, Свянцянскі, Ашмянскі, Вілейскі і Дзісенскі [18, с. 322].

У 1801 г. Беларуская і Літоўская губерні былі скасаваны, аднак да 1840 г. гэтыя назвы прысутнічалі ў справаводстве і заканадаўчых актах. Па ўказе Сената ад 5 ліпеня 1840 г. было забаронена выкарыстанне назваў «беларускія» і «літоўскія». У загадзе Мікалая I адзначалася: «Правила сего держаться и впредь…» [21, ч. 1, с. 495].

Самай дробнай адзінкай у структуры адміністрацыйнага падзелу з'яўляліся станы, на якія падзяляўся кожны павет. Колькасць станаў залежала ад памераў тэрыторыі і колькасці двароў. Напрыклад, 9 паветаў Мінскай губерні ў 1840-х гг. складаліся з 30 станаў і адной дыстанцыі (Нясвіжскай). Плошча стана залежала ад колькасці двароў. У Мінскай губерні на адзін стан прыходзілася ад 3,3 тыс. да 4,2 тыс. двароў. У сувязі з тым, што Палескі рэгіён быў маланаселены, то, напрыклад, адзін Мазырскі павет (3 станы) па плошчы быў роўны разам узятым тром паветам – Мінскаму, Навагрудскаму і Слуцкаму, у якіх налічвалася 12 станаў [22, с. 488–489].

Такім чынам, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел тэрыторыі Беларусі расцягнуўся амаль на 70 гадоў і быў практычна завершаны ў пачатку 1840-х гг. Адміністрацыйныя адзінкі амаль без істотных змен захаваліся да 1917 г.

## Літаратура і крыніцы


1. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917) / сост. Т.Е. Леонтьева. – Минск: БелНИИДАД, 2006. – 392 с.
2. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917) / Т.Е. Леонтьева [и др.]; сост. Т.Е. Леонтьева, Д.Л. Яцкевич; редкол.: А.К. Голубович (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелНИИДАД, 2009. – 524 с.
3. *Анішчанка, Я.К.* Беларусь у часы Кацярыны II (1772–1796 гады) / Я.К. Анішчанка; пад рэд. У.А. Сосны. – Мінск: ЗАО «Веды», 1996. – 220 с.; *Ён жа*. Інкарпарацыя. Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай / Я.К. Анішчанка. – Мінск: Хурсік, 2003. – 470 с.
4. Собрание трактатов и конвенций, заключенных Россией с иностранными державами / сост. Мартенс. – СПб., 1875. – Т. 2: 1772–1808 гг.
5. Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). – Собр. 1. – Т. XIX.
6. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т. 1. Першабытнаабшчынны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972.
7. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн. Кн. 1. / А.А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 584 с.
8. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 44.
9. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. XX.
10. *Рубинштейн, С.Ф.* Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет, с 1652 по 1892 / С.Ф. Рубинштейн. – Вильно, 1897.
11. *Анішчанка, Я.К.* Камеральнае апісанне – крыніца па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Усходняй Беларусі (1772–1774 гг.) / Я.К. Анішчанка // Весці Акадэміі навук БССР. – Серыя грамад. навук. – 1988. – № 3.
12. *Анішчанка, Я.К.* Генеральнае межаванне ў Беларусі / Я.К. Анішчанка. – Мінск, 1996.
13. Сбор документов, касающихся административного устройства Северо-Западного края. – Вильно, 1903.
14. *Зеленский, И.И.* Минская губерния: в 2 ч. Ч. 1 / сост. Ген. штаба подполковник И. Зеленский. – СПб., 1863.
15. ПСЗРИ / Собр. 1. – Т. XXIII.
16. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Фонд 76. – Воп. 2. – Спр. 187. – Арк. 1–3; ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. XXIV. – № 18117; ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. XVII. – № 16347.
17. Сборник императорского русского исторического общества. – СПб., 1875. – Т. XVI.
18. Энциклопедический словарь Ф.А. Брокгауза и И.А. Ефрона. Т. 6. – СПб., 1892.
19. Энциклопедический словарь Ф.А. Брокгауза и И.А. Ефрона. Т. 9. – СПб., 1893.
20. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. XXIV.
21. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. XV.
22. *Зеленский, И.И.* Минская губерния: в 2 ч. Ч. 2 / сост. Ген. штаба подполковник И. Зеленский. – СПб., 1863.



*Summary*

*The article determines reasons, nature, course and results of transformations in the administrative-territorial system of Belarusian lands when they were part of the Russian Empire on the basis of analysis of a great number of sources. The authors of the article showed not only the results of divisions of the Rzecz Pospolita for Belarus in an administrative- territorial conception but also bound these events to the home and foreign political relations in Europe in the period mentined above.*


Паступіў у рэдакцыю 29.02.2012 г.